МЕТАДАЛАГІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ КАТЭГОРЫЙ ПА-ЗА ЗНАХОДНАСЦІ І ТРАНСДУКЦЫІ Ў ПРАЦАХ М. М. БАХЦІНА І У. С. БІБЛЕРА

І. І. Таркан,
старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Канец XX – першая палова XXI стагоддзяў з'яўляецца эпохай сацыякультурных узрушэнняў. У гуманітарный думкі па-рознаму абгрунтоўваюцца іх прычыны і характар праходжання. Асаблівую актуальнасць для разумення прычын іх узнікнення набываюць ідэі першай паловы XX стагоддзя, у якіх сацыякультурныя катаклізмы разглядаліся як праява агульнага крызісу каштоўнасцяў заходняй цывілізацыі. Прыкметным напрамкам гуманітарнай думкі таго часу стала філасофія дыялогу, прадстаўнікі якой бачылі выхад з крызісу ў дыялогу заходняй культуры з культурамі мінулага і сучаснасці. Адным з прадстаўнікоў дадзенага кірунку, чые ідэі сёння набываюць усё большую актуальнасць, быў Міхаіл Міхайлавіч Бахцін.

Асэнсоўвая крызіс еўрапейскай культуры першай паловы XX стагоддзя, М. М. Бахцін разглядае яго як вынік скажэння духоўнага быцця чалавека. Асноўнай прычынай парушэння баланса чалавечых узаемаадносін, на думку М. М. Бахціна, з'яўляецца панаванне розных форм моналагізма: абсалютызацыі адных соцыякультурных магчымасей і нівеліраванне іншых. У якасці аднаго са способаў пераадолення каштоўнасна-маналагічнай устаноўкі чалавека да знешняга свету, М. М. Бахцін разглядае поліфанію [5, с. 128].

На познім этапе сваёй творчасці, М. М. Бахцін пераасэнсоўвае праблемы поліфаніі з пункту гледжання дыялога культур. Характарызуя культуру як дыялагічны феномен, філосаф адзначае, што яе можна спазнаць толькі праз іншыя культуры. Звяртаючы ўвагу на скрыты патэнцыял мінулых культур, М. М. Бахцін піша: «У кожнай культуры мінулагазакладзены агромныя сэнсавыя магчымасці, якія засталіся не разгорнутымі, не ўсвядомленымі і невыкарыстаннымі на працягу ўсяго гістарычнага жыцця дадзенай культуры» [3, с. 456]. Гэтыя магчымсці могуць існаваць у скрытым стане і раскрывацца толькі ў спрыяльных культурных кантэкстах наступных эпох. З прычыны гэтага, сэнсы той ці іншай культуры могуць уносіць карэктывы ў сучасныя сацыяльныя ўзоры і нават патрабаваць іх істотнай перабудовы. Адзначая дыялагічны характер культуры, М. М. Бахцін падкрэслівае, что сэнсы, уласцівыя якой-ліба культуры, могуць выходзіць за яе межы, актуалізавацца ў іншых сацыяльных сітуацыях, уключацца ў сэнсавыя кантэксты іншых культур і пераўтвараць іх.

М. М. Бахцін таксама аналізуе пытанні ўзаемаразумення суб'ектаў міжкультурнага дыялога. Ён лічыць неправільнай думку, згодна з якой разуменне *чужой* культуры зводзіцца толькі да *ўжывання* ў дадзеную культуру. У працэсе дыялога, *ужыванне* з'яўляецца неабходным момантам, але калі пазнанне абмяжоўваецца толькі ім, тады адбываецца простае дубляванне сэнсаў іншай культуры, якое «не будзе несці нічога новага і ўзбагачаючага» [3, с. 456]. Дыялагічнае разуменне мае сваёй перадумовай захаванне сувязі з актуальнымі сэнсамі з пазіцыяй, якую М. М. Бахцін называе *па-за знаходнасцю*.

Па-за знаходнасць суб'екта выцякае з адзінства і непаўторнасці яго месца ў быцці, якое з'яўляецца непранікальным для другога суб'екта. М. М. Бахцін падкрэслівае, што адносіны, якія узнікаюць у дыялоге, з'яўляюцца сустрэчай цэласных пазіцый, якія незвадзімы адна да адной [2, с. 67]. Паколькі ў дыялагічных адносінах суб'екты прадстаўляюць розныя каштоўнасныя светы, узнікае праблема сэнсавага адзінства *ўласнага* і *чужога* свету. М. М. Бахцін адзначае, што мяжа суб'ект-суб'ектнай недасягальнасці здымаецца з дапамогай акта *ўжывання*, які дае магчымасць зразумець прадмет з індывідуальнай пазіцыі *другога*. Аднак каб аформіць гэтую пазіцыю ў катэгорыях своеасаблівасці і цэласнасці *ўласнага* кругагляду, *ужыванне* павінна змяняцца аб'ектывізацыей ці *вяртаннем у сябе* [2, с. 18]. Аб'ектывізацыя мае на ўвазе арганічнае ўключэнне каштоўнаснай пазіцыі *другога* ва *ўласны* сэнсавы кантэкст: «Глянуўшы на сябе вачамі іншага, мы... вяртаемся ў саміх сябе і апошняя як бы рэзюмуючая падзея адбываецца ў нас у катэгорыях уласнага жыцця» [1, с. 98]. На гэтым этапе дыялога пазіцыю *па-за знаходнасці* можна ахарактарызаваць як фактар суаднясення і адзінства *ўласнай* і *чужой* пазіцыі, які дазваляе выходзіць за межы кругаглядаў суб'ектаў і ўстараняць дыстанцыю паміж імі.

Разглядаючы праблему дыялогу культур у ранніх працах М. М. Бахціна, можна сказаць, што паняцці *ўжывання* і *па-за знаходнасці*, з'яўляюцца ключавымі для разумення яго тэорыі культуры. *Ужыванне*

ў каштоўнасны свет іншай культуры, дазваляе выявіць новыя сэнсы. *Па-за знаходнасць* азначае інтэграванне гэтых сэнсаў у сістэму каштоўнасцей уласнай культуры.

Другі прадстаўнік дыялагачінай філасофіі, Уладзімір Саламонавіч Біблер, займаючыся праблемамі культуры, таксама аналізуе іх у кантэксце дыялога. У. С. Біблер адзначаў, што пазнанне другой культуры рэалізуецца як пераход да іншых магчымасцяў і варыянтаў існавання, якія выцякаюць з першапачатковага вопыту аб знешнім свеце. Гэтыя магчымасці немагчыма разглядаць як надбудовы ці асобныя катэгорыі ва ўстаноўленай сістэме светапогляду, паколькі кожная культура ўтварае замкнёны свет, са сваёй унікальнай логікай асэнсавання рэальнасці. З іншага боку, імкненне да адзінства, пры захаванні арыгінальнай значнасці кожнай культуры, не павінна прыводзіць да іх механічнага ці эклектычнага складання.

Гэты тэзіс сведыць а тым, что У. С. Біблер адмаўляе як логіку дэдукцыі, так і логіку індукцыі ў працэсе міжкультурнага дыялога. У якасці найбольш адэкватнага сродка, якое выяўляе сутнасць адносін культур, ён прымае логіку *трансдукцыі*. Паняцце *трансдукцыі* з'яўляецца адным з цэнтральных у канцэпцыі У. С. Біблера. *Трансдукцыя* мае на ўвазе пераход да іншага соцыякультурнага вопыту, на фоне якога адбываецца трансфармацыя ўласных культурных універсалій. У адрозненне ад лагічных метадаў індукцыі і дэдукцыі трансдукцыя не павінна разумецца як «узыходжанне» да нейкай больш высокай ступені разумення, але як своеасаблівая ўзаемная рэфлексія» [4, с. 14]. *Трансдукцыя* ўстанаўлівае сувязь паміж лагічнымі сэнсамі не ў катэгорыях *агульнага і асаблівага* ці *прычыны і выніка*, а ў катэгорыях раўназначнасці – *агульнага і агульнага*.

Характарызуя трансдукцыю, У. С. Біблер адзначае, што «паняцце... неабходна суаднесці з самім сабой як з іншым паняццем – паняццем другога лагічнага суб'екта, яго неабходна парадаксальна сама–абгрунтаваць» [4, с. 28–29]. Каб ажыццявіць гэтае самаабгрунтаванне логіка павінна быць асвоена як сутыкненне двух радыкальна адрозненых культур мыслення, спалучаных у адзіным дыялоге. Гэта падрузамевае актуалізацыю не толькі быцця прадмета, але і яго інабыцця, у кантэксце іншай логікі. У якасці прыклада трансдукцыі можна прывесці змену навуковых парадыгм, калі абгрунтаванне супярэчлівых фактаў патрабуе перахода на новыя лагічныя пачаткі. Згодна У. С. Біблеру без *трансдукцыі* немагчыма рэалізаваць роўнасці камунікуючых суб'ектаў.

Далей У. С. Біблер адзначае, што адной з неабходных умоў перахода ад адной сістэмы мыслення да другой з'яўляецца папярэдняя *рэдукцыя* дадзенай сістэмы ва ўсеагульнае, фундаментальнае паняцце, якое ён называе *філасофскай логікай культуры* ці *логікай пачатку логікі*. Працэс *рэдукцыі* ўяўляе *логіку руху думкі*, якая факусуецца ў адзіным пункце, у якім абрысоўваюцца межы гэтай думкі і, у той жа час, адкрываюцца магчымасці для неабсяжнай разнастайнасці лагічных вырашэнняў. Звядзенне сістэмы каштоўнасцей у аксіаматычныя паняцці, *парадаксальныя асновы быцця*, якія адлюстроўваюць першапачатковы сэнс і вопыт існавання, дазваляе вызначыць сацыяльнагістарычныя межы культуры, выявіць яе спецыфічнасць і, тым самым, адкрыць магчымасць для сустрэчы з іншымі культурамі.

Яшчэ адным важным палажэннем канцэпцыі культуры У. С. Біблер з'яўляецца роля другога суб'екта. Філосаф адзначае, што адхіленне ад уласных, рэдукаваных сэнсаў адбываецца дзякуючы з'яўленню другога суб'екта. Праз яго, як носьбіта іншых сацыяльных узораў, узнікае магчымасць перайсці да інабыцця – іншаму варыянту абгрунтавання быцця ўласнай культуры [4, с. 230]. У сувязі з гэтым *трансдукцыя*, як агульны элемент міжкультурных адносін, уяўляе дыялектыку ўнутранага і знешняга дыялога культуры. Выхад на межы культуры, адхіленне ад яе базісных сэнсаў рэалізуецца толькі праз іншую культуру.

Трансдукцыя, у працэсе міжкультурнага дыялога, таксама выступае сродкам пераўтварэння першапачатковых сэнсаў культуры і фарміравання новых. Неабходнай умовай дадзенага пераўтварэння з'яўляецца самаідэнтыфікацыя грамадства. У эпохі, калі грамадства сутыкаецца з разрывам ці антаганізмам паміж базіснымі каштоўнасцямі і аб'ектыўнай рэальнасцю свайго існавання, узнікае праблема абгрунтавання ўсяго сацыяльнага вопыту. У выніку крытычнага пераасэнсавання норм, мэт, ідэалаў і каштоўнасцей, грамадства выходзіць на мяжу сваіх культурных універсалій і адкрываецца для пошуку новых магчымасцяў развіцця. Спрабуя вызначыць сваю гістарычную неабходнасць і адказнасць, грамадства абрысоўвае сэнсы іншых светапоглядных універсалій. Прымая іх з другой культуры, яно праламляе арыгінальны змест гэтых сэнсаў у адпаведнасці з уласнай сістэмай сацыяльнага вопыту. Тым самым самаідэнтыфікацыя з'яўляецца

фактарам, які, па-першае, дае першапачатковы імпульс да міжкультурнага дыялога, і, па-другое, забяспечвае трансфармацыю ўніверсалій адной культуры ў кантэксце сацыяльнага вопыту іншай, захоўваючы унікальны статус кожнай культуры.

Абагульняючы, можна сказаць, што ў У. С. Біблера можна вылучыць тры асноўных фактара дыялога культур: самаідэнтыфікацыю, рэдукцыю і трансдукцыю культуры. Сітуацыя пераасэнсавання самаідэнтыфікацыі служыць перадумовай для ўваходжання ў дыялагічныя адносіны з іншай культурай. Рэдукцыя, выяўляя найбольш агульныя і фундаментальныя паняцці, абрысоўвае межы той ці іншай культуры і прадстаўляе яе як адну з нескалькіх магчымасцяў развіцця пэўнай гістарычнай сітуацыі. Трансдукцыя ўяўляе пераход ад светапоглядных універсалій адной культуры да ўніверсалій другой культуры. Дадзеныя ўніверсаліі не прымаюцца ў сваёй арыгінальнай значнасці, але трансфармуюцца ў кантэксце сэнсаў і сітуацыі прымаючай культуры.

Такім чынам, паняцці *ўжывання* і *па-за знаходнацсці*, *трансдукцыі* і *рэдукцыі* дазваляюць ажыццявіць тэарэтычную рэканструкцыю канцэпцый культуры ў працах М. М. Бахціна і У. С. Біблера, якія актуальны для аналізу і разумення сацыякультурных працэсаў у сучасным свеце.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Бахтин М. М. Автор и герой в эстетической деятельности / М. М. Бахтин // Собр. соч.: в 7 т. – М.: Русские словари, Языки славянской культуры, 2003. – Т. 1. Философская эстетика 1920-х гг. – с. 69–263.
2. Бахтин М. М. К философии поступка / М. М. Бахтин // Собр. соч.: в 7 т. – М.: Русские словари, Языки славянской культуры, 2003. – Т. 1. Философская эстетика 1920-х гг. – с. 7–68.
3. Бахтин М. М. Ответ на вопрос редакции «Нового мира» / М. М. Бахтин // Собрание сочинений: в 7 т. – М.: Русские словари, Языки славянской культуры, 2002. – Т. 6. «Проблемы поэтики Достоевского», 1963. Работы 1960-х – 1970-х гг. – с. 451–457.
4. Библер В. С. От наукоучения – к логике культуры. Два философских введения в двадцать первый век / В. С. Библер. – М.: Политиздат, 1991. – 412 с.
5. Гоготишвили Л. А. Варианты и инварианты М. М. Бахтина / Л. А. Гоготишвили // Вопросы философии. – 1992. – № 1. – С. 115–133.

НЕКОТОРЫЕ АСПЕКТЫ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ТЕХНОЛОГИИ КРИТИЧЕСКОГО МЫШЛЕНИЯ ПРИ ИЗУЧЕНИИ ВОЕННЫХ ПРЕОБРАЗОВАНИЙ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XVIII ВЕКА НА УРОКАХ ИСТОРИИ

Н. О. Харина,
Федеральное государственное образовательное учреждение высшего образования «Глазовский государственный педагогический институт имени В. Г. Короленко», Историко-лингвистический факультет, Глазов;

Научный руководитель:
М. А. Королев,
кандидат исторических наук, доцент

Вторая половина XVIII века в истории России – период наивысшего расцвета военного искусства. Развивая и совершенствуя петровское наследие, талантливые продолжатели, внесли существенный вклад в развитие военного образования, боевой подготовки войск, в систему комплектования и организации армии и т. д.

Изучение военных преобразований России в обозначенный хронологический период является важным моментом, который позволяет лучше узнать и понять ее особый цивилизационный путь развития.

Комплектование армии относится к числу важных факторов, которые во многом предопределили боеспособность вооруженных сил во второй половине XVIII века. Введенная еще Петром рекрутская система вплоть до 1790-х годов оставалась передовой. В период с начала Семилетней войны до конца XVIII века штатная численность русской полевой армии и гарнизонных войск возросла в 1,7 раза.